

*Актуальныя праблемы педагогікі і псіхалогіі*

# Бібліятэказнаўства і бібліятэчная справа: педагагічны аспект

*Л. А. Дзямешка, Н. У. Клімянкова, С. А. Паўлава*

**Актуальнай праблемай у пабудове і развіцці грамадства ведаў становіцца павышэнне якасці адукацыі. Спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы традыцыйна рыхтуе факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (дзённая і завочная формы навучання). Жыццё дыктуе неабходнасць на працягу навучання ў вышэйшай школе фарміраваць і развіваць у будучага спецыяліста сацыяльна-асабовыя і агульнапрафесійныя кампетэнцыі, якія з'яўляюцца асновай яго канкурэнтаздольнасці, дазваляюць свабодна валодаць сваёй прафесіяй і арыентавацца ў сумежных галінах. Дасягнуць гэтага ў значнай ступені дапаможа вызначэнне педагагічных праблем бібліятэказнаўства і асэнсаванне значнасці педагагічных ведаў для тэорыі і практыкі бібліятэчнай справы.**

Навуковая канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, прысвечаная існаванню і развіццю беларускай культуры ва ўмовах глабалізацыі, выявіла шэраг педагагічных праблем бібліятэказнаўства і бібліятэчнай справы. Іх асэнсаваннем і пошукам шляхоў вырашэння займаецца кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы (загадчык – кандыдат педагагічных навук, дацэнт С. В. Зыгмантовіч). Асноўныя вынікі навукова-даследчай дзейнасці былі адлюстраваны ў дакладах на секцыі «Сацыяльна-педагагічныя аспекты работы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне», што заслугоўвае, на наш погляд, увагі з боку педагагічна-выхаваўчай супольнасці.

Педагагічныя праблемы бібліятэказнаўства яскрава праяўляюцца ў бібліятэчнай педагогіцы, якая аказвае ўплыў на ўсе аспекты бібліятэчнай дзейнасці і асабліва – на абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк.

Тэрмін «бібліятэчная педагогіка» быў упершыню прапанаваны расійскім вучоным Б. П. Гушчыным яшчэ ў 1915 годзе [1], калі ў тэорыі педагогікі былі вылучаны дашкольная, школьная і пазашкольная віды адукацыі. Асноўным сродкам пазашкольнай адукацыі была прызнана самаадукацыя, а яе цэнтрам – бібліятэка. Змест тэрміна разглядаўся ў розныя часы тэарэтыкамі адукацыі і бібліятэказнаўцамі з розных пазіцый.

Асаблівая ўвага даследчыкаў і прафесіяналаў-бібліятэкараў была звернута на тэорыю Д. А. Балікі, які разглядаў паняцце «кіраўніцтва чытаннем» як асноўны пастулат бібліятэчнай педагогікі [2]. Праз пэўны час у навуковай і практычнай дзейнасці адбылася падмена тэрміна «бібліятэчная педагогіка» паняццем «тэорыя кіраўніцтва чытаннем», пад якім разумелася «... мэтанакіраванае ўздзеянне на змест і характар чытання з дапамогаю розных формаў і метадаў дзейнасці бібліятэк» [3, с. 900]. Асабліва такое меркаванне ўмацавалася ва ўмовах таталітарнага рэжыму, калі тэорыя партыйнай прапаганды стала значна бліжэй бібліятэчнай справе, чым педагогіка.

З розных пазіцый і ў розныя часы абгрунтоўвалі свае погляды на бібліятэчную педагогіку А. Я. Айзенберг, Л. В. Белякоў, А. М. Ванееў, Ю. У. Грыгор'еў, М. С. Карташоў, Б. Г. Умноў, Г. А. Фонатаў, Н. У. Цюліна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У. І. Цярошын, О. С. Чубар'ян і інш. У іх навуковай спадчыне, якая не страчвае дыскусійнага характару і ў XXI стагоддзі, можна вызначыць некалькі пунктаў гледжання:

- бібліятэказнаўства з'яўляецца педагагічнай навукай (Ю. У. Грыгор'еў);
- прадмет бібліятэказнаўства не супадае з прадметам педагогікі (Н. У. Цюліна);
- паміж бібліятэказнаўствам і педагогікай не можа існаваць аналогіі (Л. В. Белякоў);
- педагогіка з'яўляецца самастойным раздзелам бібліятэказнаўства (О. С. Чубар'ян);
- неабходна новая дысцыпліна: «педагогіка бібліятэчнай справы» (Л. У. Бяляева);
- бібліятэказнаўства звязана з педагогікай праз педагагічныя і выхаваўчыя функцыі бібліятэк (В. А. Барадзіна, М. Я. Дворкіна, Ю. І. Мяленцьева).

Суміруючы розныя падыходы да праблемы, можна вызначыць, што ўсе яны маюць агульную канстанту: бібліятэказнаўства суадносіцца з тымі элементамі педагогікі, тэарэтычны змест якіх мае дачыненне да бібліятэчнай справы і можа ўжывацца ў бібліятэчнай тэорыі і практыцы.

Асэнсаванне сутнасці бібліятэчна-педагагічнай дзейнасці, вызначэнне паняцця бібліятэчнай педагогікі, яе прадмета, аб'екта, задач, прынцыпаў і асноўных катэгорый маюць вялікае значэнне з пункту гледжання абгрунтавання генезісу і дынамікі развіцця адзначанай галіны навукі, перспектыў яе далейшага існавання ў зменлівым сацыякультурным асяроддзі. Мы імкнуліся вылучыць тэарэтычныя падыходы да зместу і сутнасці педагагічных працэсаў у бібліятэцы: бібліяцэнтрысцкі (агульнабібліятэчны), камунікатыўны, кагнітывісцкі, акмеялагічны і бібліятэрапеўтычны. Важнейшым элементам педагагічнага працэсу прызнаны зносіны бібліятэкара з карыстальнікам. Іх характар вызначае спецыфіку педагагічнага ўзаемадзеяння ва ўмовах бібліятэчнага абслугоўвання. Мы паспрабавалі таксама прасачыць сувязь бібліятэчнай педагогікі з іншымі галінамі педагагічных ведаў [4]. Аднак тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчнай педагогікі, яе задачы, прынцыпы і катэгорыі пакуль яшчэ далёкія ад шматаспектнага, комплекснага абгрунтавання.



*Лілія Адамаўна Дзямешка,*
*прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*кандыдат педагагічных навук*

На сучасным этапе развіцця вучоныя разглядаюць бібліятэчную педагогіку і як спецыяльную галіну педагогікі, сфарміраваную на базе інтэграцыі з бібліятэказнаўствам [5], і як міждысцыплінарны раздзел бібліятэказнаўства, створаны на падставе яго сінтэзу з педагогікай [6]. У любым выпадку яе прадметам з'яўляюцца педагагічныя аспекты бібліятэчнай справы, выяўленне задач, дыдактычных прынцыпаў, катэгорый і метадаў арганізацыі ўзаемадзеяння ў сістэме «бібліятэка – карыстальнік».

*Бібліятэчная педагогіка* – гэта навука аб сутнасці фарміравання і развіцця чытача, карыстальніка бібліятэкі, ва ўсёй шматбаковасці яго ўзаемадзеяння са сферай інфармацыі, бібліятэчным асяроддзем, інфармацыйнымі рэсурсамі, прадуктамі і паслугамі. Бібліятэчная педагогіка вывучае заканамернасці і абгрунтоўвае тэарэтычныя палажэнні, распрацоўвае прынцыпы, метады, формы і тэхналогіі чытацкага развіцця, выхавання і навучання сродкамі чытання. Чытанне выступае і як сродак фарміравання асобы, і як інструмент вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

*Аб'ектам* бібліятэчнай педагогікі выступаюць чытацкае развіццё, фарміраванне чытацкай і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк. *Прадметам* – педагагічны працэс, які ажыццяўляецца ў ходзе ўзаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам і накіраваны на пераўтварэнне яго асобасных уласцівасцей і якасцей пад уплывам успрымаемай і перапрацоўваемай інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



***Ніна Уладзіміраўна Клімянкова,***
*дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук*



***Сафія Антонаўна Паўлава,***
*прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук*

*Мэта* бібліятэчнай педагогікі – фарміраванне навукова абгрунтаваных уяўленняў аб заканамернасцях бібліятэчна-бібліяграфічнага ўплыву на чытацкую свядомасць, чытацкую дзейнасць і чытацкія зносіны, станаўленне і развіццё адукаванай, творчай асобы са шматбаковым мысленнем, высокай чытацкай і інфармацыйнай культурай. Не апошнюю ролю адыгрывае таксама тэарэтычнае абгрунтаванне педагагічных працэсаў, што ажыццяўляюцца ў бібліятэцы як у ходзе абслугоўвання карыстальнікаў, так і падчас станаўлення і развіцця бібліятэчнага калектыву.

*Задачамі* бібліятэчнай педагогікі выступаюць: фарміраванне ў карыстальнікаў бібліятэк навыкаў прадуктыўнага чытання, пошуку і выбару неабходнай інфармацыі, сістэмы бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў, а таксама – выхаванне ўстойлівага інтарэсу да чытання і імкнення да самаадукацыі.

Метадалагічную аснову бібліятэчнай педагогікі складае агульнапедагагічная тэорыя выхавання. Бібліятэчная педагогіка абапіраецца таксама на педагогіку дарослых, бібліятэказнаўства, чытачазнаўства, сацыялогію і псіхалогію чытання, сацыяльную псіхалогію і сацыяльную педагогіку, іншыя навукі. Змест бібліятэчнай педагогікі складаюць такія раздзелы, як «Педагагічныя зносіны», «Тэорыя чытацкага развіцця», «Фарміраванне культуры чытання як педагагічны працэс», «Інфармацыйная дыдактыка», «Педагагічная і камунікатыўная культура бібліятэкара».

Асноўныя тэорыі бібліятэчнай педагогікі грунтуюцца на ідэях аб прыродзе чытання, яго ролі і значэнні ў інтэлектуальным і духоўным развіцці асобы [7], а таксама аб прыродзе бібліятэчных зносін як інфармацыйнага і прадметнага ўзаемадзеяння, абумоўленага пошукам неабходных матэрыялаў для чытання, арганізацыяй чытацкай дзейнасці, абмеркаваннем прачытанага. Прычым на першае месца ставяцца пастулаты педагогікі супрацоўніцтва, якія дазваляюць уплываць на чытанне і чытацкія паводзіны, не ўжываючы націску на псіхіку карыстальніка.

Важнейшым элементам педагагічнага працэсу ў бібліятэцы з'яўляюцца зносіны бібліятэкара з карыстальнікам, як непасрэдныя, так і апасродкаваныя. Па сваёй прыродзе бібліятэка займае прамежкавае становішча паміж інстытутамі спантаннай сацыялізацыі (сяброўскімі групамі, сродкамі масавай інфармацыі, асветніцкімі грамадскімі арганізацыямі і інш.) і адукацыйнымі ўстановамі, прызванымі мэтанакіравана ажыццяўляць выхаванне, навучанне і адукацыю. З першымі яе збліжаюць даверлівы характар зносін у ходзе педагагічнага ўзаемадзеяння, адсутнасць прамога прымусу, арыентацыя на індывідуальныя інтарэсы і патрэбы карыстальніка, спантаннасць узнікнення і заканчэння кантактаў, іх імправізацыйны характар. Другія прыўносяць у бібліятэчныя зносіны і абслугоўванне элементы сістэматычнасці, паслядоўнасці, нагляднасці і іншых дыдактычных прынцыпаў, калі бібліятэкару даводзіцца мець справу са спецыяльна арганізаванай для праходжання навучання асновам інфармацыйнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры групай або чытацкім аб'яднаннем у межах адукацыйнай, сацыяльна-педагагічнай праграмы, праекта. У любым выпадку бібліятэка супрацоўнічае і ўзаемадзейнічае як з інстытутамі спантаннай сацыялізацыі, так і з установамі сістэмы адукацыі, інфармацыйна забяспечваючы іх дзейнасць, ажыццяўляючы метадычную дапамогу ў пошуку і засваеннні неабходнай інфармацыі, пераўтварэнні яе ў веды. Асобае месца ў педагагічнай дзейнасці бібліятэкі займае садзейнічанне самаадукацыі карыстальнікаў, што традыцыйна выступае ў якасці істотнай задачы любой бібліятэчна-інфармацыйнай установы.

Прынцыпы дыдактыкі – сістэматычнасці, паслядоўнасці, свядомасці і актыўнасці навучэнцаў, даступнасці, нагляднасці, трываласці засваення ведаў, індывідуальнага падыходу – альбо зусім «не працуюць» ва ўмовах бібліятэчнага абслугоўвання, альбо могуць быць рэалізаваны ў абмежаваным маштабе. Напрыклад, прынцыпы сістэматычнасці, паслядоўнасці, трываласці засваення ведаў у адносінах узаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам абмежаваныя кароткачасовасцю, эпізадычнасцю кантактаў, немагчымасцю загадзя прадугледзіць наведванне бібліятэкі карыстальнікам. Ён жа ідзе туды не тады, калі гэта неабходна бібліятэкару для ажыццяўлення педагагічнага ўплыву, а ў зручны для сябе час. Прынцып даступнасці рэалізуецца не столькі праз падачу інфармацыі ў даступнай для карыстальніка форме, колькі шляхам забеспячэння свабоднага і поўнага доступу да інфармацыйных рэсурсаў. Дадзены прынцып таксама прадугледжвае дыферэнцаваны падыход да чытачоў з улікам іх узроставых, гендарных, сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцей і ўзроўню інфармацыйнай культуры. Трываласць засваення ведаў нельга таксама рэалізаваць ва ўмовах бібліятэкі, таму што кантроль за набываемымі ведамі ажыццяўляецца па-за яе межамі і не ўваходзіць у функцыі бібліятэчна-інфармацыйнай установы.

Бібліятэчнае абслугоўванне наогул прынцыпова адрозніваецца ад працэсу арганізаванага выхавання і навучання, перш за ўсё тым, што зносіны тут маюць спантанны характар. Бібліятэкар і чытач значна менш залежаць адзін ад аднаго. Яны не аб'яднаны ў педагагічным працэсе, як выкладчык і навучэнец. Чытач вольны як аднавіць зносіны па ўласным разуменні, так і перапыніць іх па сваім жаданні, чаго не можа сабе дазволіць навучэнец без рызыкі апынуцца па-за межамі навучальнай установы за парушэнне вучэбнай дысцыпліны.

Змястоўны кампанент узаемадзеяння таксама істотна адрозніваецца ў бок менш фармалізаваных зносін і, у рэшце рэшт, мае характар імправізацыі. Выкладчык павінен ведаць наперад, аб чым пойдзе гаворка на ўроку, каго трэба выклікаць, якое хатняе заданне даць. Бібліятэкар абсалютна вольны ў выбары сродкаў зносін, аднак ён не можа прадугледзіць пытанняў, якія ўзнікнуць падчас размовы, падрыхтавацца да адказу на іх загадзя.

Узаемадзеянне бібліятэкара з карыстальнікам максімальна індывідуалізавана, таму прынцып індывідуальнага падыходу – адзін з нямногіх, які «працуе» і ў бібліятэчным абслугоўванні. Аднак яго канкрэтнае ўвасабленне таксама мае сваю, бібліятэчную, спецыфіку.

Такім чынам, кіравацца дыдактычнымі прынцыпамі ў індывідуальным і франтальным абслугоўванні карыстальнікаў або зусім немагчыма, або магчыма, але пры наяўнасці істотных абмежаванняў. Нават прынцып нагляднасці ў абслугоўванні праяўляецца вельмі своеасаблівa і выконвае не столькі дапаможную, ілюстрацыйную ролю, колькі адну з асноўных – раскрыцця фонду, прадастаўлення найбольш поўнай інфармацыі аб яго змесце, каштоўнасці і наяўнасці дакументаў.

Сутнасць педагагічнага мыслення бібліятэкара заключаецца ў тым, што тэарэтычныя пастулаты і агульнапрызнаныя прынцыпы педагагічнай навукі мадыфікуюцца ў ходзе іх практычнага выкарыстання ў бібліятэчным абслугоўванні з улікам спецыфікі педагагічнага працэсу ў бібліятэцы. Педагагічная практыка тут прымае формы гутаркі-рэкамендацыі, размовы аб прачытаным, кансультавання, інфармавання, масавага мерапрыемства, мэтавай комплекснай праграмы, арганізацыі чытацкіх аб'яднанняў і інш. Педагагічны кампанент прысутнічае ў бібліятэчнай рэкламе, рабоце з сацыяльна не абароненымі групамі і індывідамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

псіхалагічным кансультаванні, кіраванні на ўсіх яго ўзроўнях.

Бібліятэчная педагогіка накіравана на развіццё прыродных здольнасцей карыстальніка, інфармацыйна забяспечваючы яго самаадукацыю і самавыхаванне. Чытанне спрыяе самарэалізацыі асобы, разуменню сябе і іншых, адэкватнай ацэнцы свету. Найважнейшай педагагічнай задачай з'яўляецца распрацоўка прынцыпаў выбару крыніц інфармацыі для самаадукацыі, а таксама рацыянальных метадаў, прыёмаў самаадукацыйнага чытання, яго эфектыўнай арганізацыі. Фарміраванне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў выступае ў якасці істотнай педагагічнай задачы сучаснай бібліятэкі, у працэсе вырашэння якой найбольш поўна рэалізуюцца прынцыпы дыдактыкі, што садзейнічае забеспячэнню інфармацыйнай бяспекі асобы.

Кожны з існуючых сацыяльна абгрунтаваных прыярытэтных кірункаў бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання: фарміраванне прававой культуры насельніцтва, дапамога ў бесперапыннай адукацыі карыстальнікаў, дапамога наведвальнікам з «асаблівымі патрэбнасцямі», фарміраванне культуры чытання і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў – знаходзіць сваю апору ў адпаведнай педагагічнай тэорыі або галіне педагогікі.

Асноўныя катэгорыі бібліятэчнай педагогікі – гэта кіраўніцтва чытаннем (мэтанакіраванае і планамернае ўздзеянне на змест і характар чытання); фарміраванне культуры чытання (уменне арыентавацца ў інфармацыйным асяроддзі, знаходзіць і адбіраць неабходныя матэрыялы для чытання, успрымаць і спажываць заключаную ў іх інфармацыю, пераўтвараючы яе ў веды); чытацкае развіццё асобы (пераход у новы якасны стан навыкаў чытання, здольнасцей да выбару, перапрацоўкі і засваення інфармацыі, асобасных якасцей, пазнавальных працэсаў); чытацкая свядомасць (сістэма поглядаў, ідэй, уяўленняў, ведаў, меркаванняў, эмоцый, інтарэсаў, установак, памылак, ілюзій і г. д., што ўзнікаюць на падставе чытацкага вопыту і ўзаемадзеяння з іншымі чытачамі); чытацкая дзейнасць (разнавіднасць педагагічнай сістэмы, якая падпарадкоўваецца прынцыпам самаарганізацыі, самарэгуляцыі і самакіравання і абумоўлена мэтамі, зместам чытання і сродкамі ажыццяўлення чытацкай дзейнасці); чытацкія зносіны (спосаб існавання і пазнання ўласнага чытацкага Я і чытацкага свету ў міжчытацкіх зносінах на падставе абмену думкамі, меркаваннямі, ацэнкамі з нагоды прачытанага; узнікненне, устанаўленне, развіццё, а таксама разбурэнне і скасаванне кантактаў паміж чытачамі); інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе бібліятэкі (матэрыяльныя, духоўныя і інфармацыйныя ўмовы ажыццяўлення педагагічна-адукацыйнай дзейнасці).

Як ужо адзначалася вышэй, асаблівае значэнне набывае педагогіка супрацоўніцтва, якая дазваляе ўплываць на чытанне і чытацкія паводзіны, не ўжываючы націску на псіхіку карыстальніка бібліятэкі. Яна з'яўляецца канцэптуальнай асновай бібліятэчнага абслугоўвання чытачоў, асабліва дзяцей, падлеткаў і юнакоў. У прафесійным друку разглядаюцца псіхолага-педагагічныя аспекты ўплыву мастацтва слова на асобу, яе інтэлектуальнае, эмацыйнае і маральнае развіццё. Значна паўплывала на тэорыю і практыку чытацкага развіцця дзейнасць М. А. Рубакіна [8]. Створаная ім бібліяпсіхалогія як навука аб чытанні, чытачы, яго ўзаемадзеянні з аўтарам кнігі падкрэслівае асаблівую значнасць педагогікі супрацоўніцтва.

Думкамі аб тым, што чытанне з'яўляецца творчым працэсам, а прырода творчасці пісьменніка і творчасці чытача мае шмат агульнага, прасякнуты работы А. М. Лявідава, А. А. Ляонцьева, Л. С. Выгоцкага і інш. [9]. Аналіз тэарэтычных прац педагогаў, псіхолагаў, бібліятэказнаўцаў мінулага сведчыць, што гісторыя ўяўляе цікавасць не толькі рэтраспектыўна, але і ў дачыненні да праблем сучаснасці. У выхаваўчай практыцы бібліятэкару немагчыма абысціся без педагогікі супрацоўніцтва. Пры гэтым неабходна падкрэсліць значэнне цэласнасці сістэмы ўзаемадзеяння з карыстальнікам, якая дасягаецца за кошт скіраванасці на чытацкае развіццё асобы ўсіх складнікаў тэорыі выхавання: прынцыпаў, зместу, метадаў і арганізацыйных формаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Напрыклад, у аснову пабудовы сістэмы ўзаемадзеяння з малодшым школьнікам пакладзены прынцыпы педагогікі супрацоўніцтва, адаптаваныя да ўмоў бібліятэкі і псіхалагічных асаблівасцей дадзенага тыпу чытачоў. У першую чаргу – гэта апора на дамінантную эмацыянальную актыўнасць дзяцей, патрэбу ў гульні, багацце вольнага ўяўлення, нечаканасць асацыятыўных рэакцый. Эмацыянальная актыўнасць з'яўляецца каштоўнаснай якасцю псіхікі маленькага чытача. Галоўная скіраванасць работы бібліятэкара – арыентацыя на дзіцячую радасць, захапленне, стварэнне пэўнага асяроддзя гульні, праяўленне фантазіі, актыўнасці, дзейснасці. На наш погляд, эфектыўнасць педагогікі супрацоўніцтва ва ўзаемадзеянні бібліятэкара з маленькім чытачом забяспечваецца: суб'ект-суб'ектнымі адносінамі паміж імі, стварэннем умоў для вольнага самавыяўлення кожнага дзіцяці, забеспячэннем багатай духоўнай эмацыянальнай і разумовай жыццядзейнасці, выкарыстаннем разнастайных прыёмаў, формаў і метадаў бібліятэчнага абслугоўвання, якія абапіраюцца на гульнёвую дзейнасць.

*На сучасным этапе неабходна, выкарыстоўваючы дасягненні педагагічнай навукі, распрацаваць і абгрунтаваць прынцыпы бібліятэчнай педагогікі, паказаць яе месца і ролю ў шматбаковай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, сканцэнтраваць увагу на педагагічным асэнсаванні праблем узаемадзеяння і ўзаемнага ўплыву бібліятэкі і карыстальніка, а таксама падрыхтоўкі бібліятэчнага персаналу, яго інтэграцыі ў педагагічны працэс і прафесійнай адаптацыі да новых рэалій бібліятэчнай практыкі.*

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Ванеев, А. Н.* Библиотечное дело. Теория. Методика. Практика / А. Н. Ванеев. – СПб., 2004. – С. 24–32.

2. *Балика, Д. А.* Библиотека в свете современной педагогики / Д. А. Балика // Библиотека: сб. ст. – М.; Л., 1927. – С. 16–39.

3. Библиотечная энциклопедия. – М.: Пашков дом, 2007. – 1020 с.

4. *Дзямешка, Л. А.* Педагагічная навука і бібліятэказнаўства: праблемы ўзаемадзеяння / Л. А. Дзямешка // Адукацыя і выхаванне. – 2010. – № 7. – С. 43–48; *Клімянкова, Н. У.* Бібліятэчна-педагагічная дзейнасць: накірункі і перспектывы развіцця / Н. У. Клімянкова // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 12. – С. 44–49.

5. *Айзенберг, А. Я.* О содержании курса «Библиотечная педагогика» / А. Я. Айзенберг // Сов.библиотековедение. – 1985. – № 1. – С. 56–64.

6. *Терёшин, В. И.* Библиотека – педагогическая система / В. И. Терёшин // Библиотековедение. – 1998. – № 5. – С. 33–46.

7. *Збаровская, Н. В.* Библиотечная педагогика как научная дисциплина / Н. В. Збаровская // Библиотековедение. – 2006. – № 2. – С. 118–125; Развитие педагогических функций советских библиотек: межвуз. сб. – М.: Мос. гос. ин-т культуры, 1991. – 326 с.

8. *Рубакин, Н. А.* Практика самообразования / Н. А. Рубакин // Избранное: в 2 т. – М.: Книга, 1975. – Т. 2. – 278 с.

9. *Выготский, Л. С.* Педагогическая психология / Л С. Выготский; под ред. В. В. Давыдова. – М.: Педагогика, 1991. – 375 с.; *Левидов, А. М.* Автор – образ – читатель / А. М. Левидов. – Л.: Изд-во ЛГУ, 1983. – 350 с.; *Леонтьев, А. А.* Педагогическое общение / А. А. Леонтьев. – М.: Знание, 1979. – 150 с.

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 07.02.2011.*

АіВ



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ